# ВЫКАРЫСТАННЕ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У СУЧАСНЫХ СВЯТАХ ВЕСНАВОГА ЦЫКЛА

***Н. І. Гуд,***
*старшы выкладчык БДУКМ*

У багатай культурнай спадчыне народаў свету, у тым ліку і беларусаў, асабліва вялікая роля належыць каляндарным звычаям і абрадам, народным святам, што ўяўляюць сабой складаную грамадскую з'яву. Яны адлюстроўваюць разнастайныя бакі сацыяльна-палітычнага, этнічнага, гісторыка-культурнага жыцця народаў на розных этапах развіцця і, у першую чаргу, нясуць на сабе этнічную спецыфіку. Этнічны, эстэтычны, эмацыянальны дух, закладзены ў беларускіх каляндарных абрадах і звычаях, заўсёды сцвярджаў перамогу дабра над злом, найвялікшую каштоўнасць жыцця чалавека, якое было цесна звязана з жыццём прыроды і ўсяго Сусвету. Кожнае абрадавае дзеянне, магічны прыём, замова, прымета спрыялі захаванню і працягу роду, паляпшэнню дабрабыту, ушанаванню продкаў.

Веснавы цыкл народных святаў надзвычай складаны і функцыянальна шматпланавы. Яго галоўнай ідэяй была ідэя нараджэння і аднаўлення прыроды ў яе вечным колазвароце жыцця і смерці. Вясной пачыналіся самыя адказныя сялянскія работы: ворыва, сяўба, выган скаціны ў поле. Важныя вехі ў працоўнай дзейнасці селяніна мелі адпаведныя звычаі і абрады [2].

**Гуканне вясны.** На высокім месцы раскладалі вогнішча, спявалі вяснянкі, вадзілі карагоды («Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць»); выраблялі печыва ў выглядзе птушак; ушаноўвалі бярозу (кідалі на яе кастрыцу і інш. або ўпрыгожвалі стужкамі), закопвалі ў зямлю гаршчок кашы (своеасаблівая ахвяра зямлі). Таксама гушкаліся на арэлях, «затанцоўвалі» вясну. Паступова абрад ператварыўся ў забаву моладзі.

**Першы выган жывёлы** («запасванне гаўяда»). Звычайна прымяркоўваюць да Юр'я, які лічыцца заступнікам жывёлы – 6 мая. Юр'ева раса лічылася цудадзейнай, напярэдадні ўпершыню выводзілі коней на начлег («Юрай замыкае ваўкам раты»). Звычайна гаспадар тройчы абыходзіў свой статак з запаленай грамнічнай свечкай, гаспадыня абкурвала «жывацінку» святаянскімі зёлкамі (сабранымі на Купалле), пастух лёгка сцёбаў кожную жывёліну асвечанай на Вербніцу вярбінкай. Пад браму,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праз якую выганялі жывёлу, клалі замкнутыя замком ніты ці замок («замкнуць ваўку зубы»). У гэты дзень адбываліся агледзіны нівы, меркавалі пра будучы ўраджай.

**Сёмуха** (Тройца, Зялёныя святкі) – 50-ы дзень пасля Вялікадня. У аснове – культ зеляніны, шлюбу і продкаў («Зелянец – вясны канец»). Прыбіралі двор і хату «маем» (клён, бяроза, аер), прыводзілі ў парадак магілы (у субботу, сёмушныя дзяды). У царкве асвячалі лугавыя і палявыя зёлкі (пазнейшая з'ява). Да гэтага дня прымяркоўвалі вяселле, адбывалася кумаванне, запрошвалі ў госці. Пасля Сёмухі – Русальны тыдзень; праводзілі ў поле «русалку» (лічылася захавальніцай урадлівасці, апякункай зямлі і воднай стыхіі), каб забяспечыць добры ўраджай [1].

Абрады гукання вясны як найменш звязаныя з рэлігійнай абраднасцю бытавалі ў 1920-я гг. у аўтэнтычных формах у сельскай мясцовасці. Са з'яўленнем камун і калгасаў у БССР звязана станаўленне сацыялістычнага свята, якое мела назву «Дзень першай баразны» або «Дзень чырвонай баразны». Цэнтральным момантам свята з'яўляўся мітынг, на якім кіраўнікі гаспадаркі віншавалі з пачаткам сяўбы, лепшым механізатарам давалі права першымі вывесці машыны ў поле і пачаць ворыва. У першы дзень палявых работ увечары вызначалі пераможцаў, віншавалі іх, уручалі падарункі і сувеніры. Пасля завяршэння сяўбы ў многіх гаспадарках ладзілі свята вясны, ва ўрачыстую частку якога ўваходзілі пад'ём сцяга, рапарт аб заканчэнні палявых работ, віншаванні перадавікоў, уручэнне каштоўных падарункаў, грамат, вымпелаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва, конкурсу прафесійнага майстэрства. Свята завяршалася канцэртам мастацкай самадзейнасці, затым песні і танцы падхоплівалі гледачы і пачыналася ўсеагульная весялосць, у некаторых гаспадарках у час свята вясны арганізоўваліся спартыўныя спаборніцтвы: легкаатлетычныя забегі, гульня ў футбол, валейбол, конныя скачкі і г.д. Позна вечарам у клубах дэманстраваліся бясплатныя кінафільмы. Час правядзення святаў першай баразны і вясны залежаў ад тэрмінаў пачатку і заканчэння сяўбы і не меў пастаяннай даты. У першых камунах свята першай баразны адзначалася асабліва ўрачыста, у поле выязджалі з транспарантамі, плакатамі, пад гукі музыкі, вечарам ладзілі святочны стол.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да Усходняй свята першай баразны і вясны пачало распаўсюджвацца і там [4].

У першыя гады савецкай улады сёмушную і русальную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абраднасць закранулі невялікія змены, бо камсамольцы рэспублікі, якія актыўна ўкаранялі «чырвонаю абраднасць», не звярталі на яе вялікай увагі. Як сведчаць матэрыялы этнаграфічных экспедыцый, Сёмуху адзначалі як вялікае свята з гульнямі каля рэчкі, возера, з танцамі і песнямі да пачатку вайны. Стойка захоўваўся ў даваенны перыяд звычай упрыгожваць сядзібы зелянінай.

У пасляваенны перыяд свята вясны, пэўным чынам трансфарміруючыся пад уздзеяннем істотных змен, што адбываліся ў сельскагаспадарчай вытворчасці, працягвала актыўна бытаваць у сельскай мясцовасці Беларусі. У 1970–1980-я гг. яно ладзілася звычайна ў гаях, на берагах рэк, азёр, дзе адпачывалі жыхары кожнай вёскі. У гэты перыяд пачалі з'яўляцца на свяце тэатралізаваныя моманты – персанажы Вясны з вяснянкамі, зазывалы і г.д. Нягледзячы на некаторыя лакальныя асаблівасці, усе святы, звязаныя з пачаткам і заканчэннем сяўбы, на Беларусі ў гэты перыяд мелі тры важнейшыя эпізоды ў сваёй структуры: урачыстыя провады механізатараў у поле, пракладка першай баразны лепшым механізатарам калгаса (саўгаса), заканчэнне сяўбы, якое адзначалася масавымі гуляннямі і ўслаўленнем тых, хто лепш працаваў у час пасяўной.

У 1960–1980-я гг. да Сёмухі прымяркоўвалі свята, якое называлася «Провады вясны» або «Свята рускай бярозкі». У іх падрыхтоўцы і правядзенні актыўную ролю адыгрывалі культработнікі рэспублікі. Галоўнае месца ў свяце провадаў вясны займала працоўная тэматыка. Асноўнымі персанажамі былі антрапаморфныя вобразы – Бярозка, Вяснянка, якія падзяляліся на аснове сімволікі традыцыйных веснавых песень. Пра дзень свята, а гэта была звычайна нядзеля, паведамлялі афішы, мясцовыя газеты і радыё, а лепшым працаўнікам рассылаліся запрашальныя білеты. У месцы правядзення свята ставілі бярозку, упрыгожаную каснікамі, вянкамі, эстрадную пляцоўку таксама ўпрыгожвалі гірляндамі зяляніны і кветак. Свята звычайна адкрываў прадстаўнік раёна ці дырэкцыі саўгаса (калгаса). Пасля невялікага выступлення ён запрашаў на сцэну дзяўчыну, што ўвасабляла Вясну ці Бярозку. Яна выклікала лепшых працаўнікоў, пераможцаў, уручала ім граматы, узнагароды, павязвала ленты з раслінай сімволікай. Пасля гэтага пачыналася мастацкая частка – канцэрт, танцы, конкурсы, гульні.

У пачатку 1990-х гг., калі калгасы і саўгасы прыйшлі ў эканамічны заняпад, сацыялістычныя святы «Дзень першай баразны», «Дзень чырвонай баразны» перасталі праводзіцца на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі. Затое ў гэты перыяд сталі актыўна адраджацца абрады гукання вясны, якія мелі ў сабе традыцыйная элементы, песні, гульні.

Сёння свята гукання вясны пад рознымі назвамі надзвычай шырока распаўсюджаны ў розных дзіцячых і дарослых калектывах на Беларусі. Падагуліўшы шматлікія матэрыялы па гэтай тэме, можна адзначыць, што выпрацаваўся ўжо даволі ўстойлівы сцэнарый правядзення сучаснага гукання вясны як у вёсцы, так і ў горадзе, склалася адпаведная сімволіка і атрыбутыка, замацаваны персанажы, якія асацыіруюцца з гэтым святам: галінкі вярбы, бярозы і іншых дрэў, птушак з саломы, паперы або выпечаныя з цеста, выявы жывёл і прылад сельскагаспадарчай працы, пастуховай торбы, сявенькі для Вясноўкі і інш.

У многіх вёсках Беларусі адрадзіліся абсалютна арыгінальныя мясцовыя абрады і песні гукання вясны «Саракоў», якія доўгі час захоўваліся ў сацыяльнай памяці людзей. Безумоўна, гэты працэс ідзе больш актыўна там, дзе ёсць зацікаўленыя культработнікі і створаныя імі фальклорна-этнаграфічныя ансамблі.

На хвалі адраджэння, якое пачалося ў Беларусі ў 1990-я гг., узрасла цікавасць і да юраўскага свята. Культработнікі рэспублікі пачалі адшукваць на месцах звесткі пра свята і разам з фальклорнымі калектывамі аднаўляць яго ў сваіх вёсках. Паступова свята, падрыхтаванае самадзейнымі артыстамі, адзначалася ўсёй вёскай, калі яно ў мінулым мела тут адметныя традыцыі правядзення. Так здарылася ў Ваўкавыскім, Слонімскім раёнах Гродзенскай вобласці, у в. Вуглы Капыльскага раёна Мінскай вобласці, в. Малыя Зімовічы Мазырскага раёна Гомельскай вобласці і многіх іншых.

У 1990-я гг. культработнікі рэспублікі, абапіраючыся на канкрэтны мясцовы фальклорна-этнаграфічны матэрыял, пачалі адраджаць Сёмуху. Спачатку свята паказвае і ладзіць фальклорны калектыў, а затым вяскоўцы праводзяць яго самастойна.

Вельмі цікава сёння праводзяцца адроджаныя сёмушныя і русальныя абрады ў многіх раёнах Гродзенскай вобласці: Слонімскім, Іўеўскім, Шчучынскім, Ваўкавыскім [3].

У тых беларускіх вёсках, дзе да рэвалюцыі на Тройцу былі прастольныя святы, фэсты, яны зноў адрадзіліся з пачатку 1990-х гг. У іх арганізацыі і правядзенні прымаюць удзел і культработнікі, і святары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пад уплывам ідэй адраджэння актывізавалася традыцыйная народна-побытавая культура ў аўтэнтычнай і другасных формах яе бытавання. Людзі пачалі імкнуцца да творчай самарэалізацыі, і гэта асабліва ярка выяўляецца ў абрадава-святочнай сферы. Сёння рэзка ўзрасла і цікавасць моладзі да традыцыйных каляндарных святаў і абрадаў. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца па ўсёй Беларусі веснавыя святы. Калі яны абапіраюцца на абрады і звычаі сваёй мясцовасці, то праходзяць асабліва запамінальна, пакідаюць у ўдзельнікаў адчуванне непарыўнай сувязі, еднасці з тым, што можна назваць душой Радзімы.

1. Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі. – Мінск, 1990. – С. 1–110.

2. *Крук, І.* Следам за сонцам. Беларускі народны каляндар / І. Крук. – Мінск, 1998. – С. 20–116.

3. *Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск, 2001. – 237с.

4. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 1989. – С. 236–238, 161–162, 309, 461.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ